ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 123 | АЎТОРАК, 30 МАЯ 1933 г. | № 123

Японія акупавала Бэйпін.

ШАНХАЙ, 26. Як паведамляе агэнцтва „Рэйтэр", Бэйпін напоўнен бежанцамі з раёнаў ваенных дзеяньняў. Сёньня раніцай над Бэйпінам праляцелі 9 японскіх разьведчыкаў і адзін бамбардыроўшчык, якія, паводле слоў агэнтцва, відавочна наглядалі за дзеяньнямі кітайскіх войск. Японскія ўлады ў Бэйпіне ўчора скасавалі загад аб сканцэнтраваньні японскіх рэзыдэнтаў у квартале японскага пасольства. Замест гэтага патрулі ўзмоцненага ўчора японскага гарнізону цыркулююць па ўсім горадзе „для аховы японскіх рэзыдэнтаў". На кожных двух японскіх рэзыдэнтаў у Бэйпіне прыпадае цяпер адзін японскі салдат. Кітайскія ўлады санкцыянавалі пасылку японскіх патруляў у горад і папярэдзілі насельніцтва, каб яно захавала спакой і займалася сваімі справамі. Такім чынам, Бэйпін фактычна акупован японцамі, хоць яго занялі не наступаючыя войскі, а мясцовы гарнізон.

Напады хунхузаў на ўсходнюю лінію КУЧ.

ХАБАРАЎСК, 25. Паводле атрыманых звестак, становішча на ўсходняй лініі КУЧ усё абвастраецца ў сувязі з частымі нападамі і рабункамі бандыцкіх шаек, прычым назіраюцца частыя выпадкі пераходу манчжурскіх ахоўных войск на бок хунхузаў. З прычыны поўнай адсутнасьці аховы, жыхары станцыі Ўцзімы і раду іншых у паніцы разьбягаюцца.

Забарона кампартыі Аўстрыі.

ВЕНА, 27. Аўстрыйскі ўрад выдаў загад аб неадкладнай забароне камуністычнай партыі ў Аўстрыі. Забарона матывуецца „нелегальнай, антыдзяржаўнай дзейнасьцю" кампартыі.

Паводле слоў „Нэйе Фрэйе прэсэ", забарона кампартыі нібы выклікана тым, што паліцыя „напала на сьлед інтэрнацыянальнай змовы". Сацыял-дэмакратычная „Арбэйтэр цэйтунг" фармальна пратэстуе супроць забароны кампартыі, што, паводле яе слоў, зьяўляецца парушэньнем канстытуцыі, скарыстоўваючы, аднак, забарону для новага цкаваньня камуністаў. Забарона „Ротэ Фане" чакаецца сёньня.

ВЫЙСЬЦІ З ГЛЫБОКАГА ТЫЛУ СПАБОРНІЦТВА ТРОХ РАЁНАЎ.

КІРАЎНІЦТВА РУДНІЦКАГА, ДАЎЖАНСКАГА І РУДАКОЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ НЯЗДОЛЬНА ЗАБЯСЬПЕЧЫЧЬ ВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ І ЎРАДУ АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ СЯЎБЫ.

Разграміць кулацкі сабатаж, нанесьці руйнуючы ўдар па кулаку і яго агэнтах.

РУДНІЦЫ ПАВІННЫ ВЫЙСЬЦІ З ПРАРЫВУ.

Рудніцкі сельсавет застаўся на 14-м месцы ходзе пасеўнай кампаніі на Віцебшчыне і сеў на 26 мая толькі 31,7 проц. замацоўваюць яго на чорнай дошцы.

У сельсавеце толькі калгас імя Ланцуцкага ракрочыў за 50 проц. выкананьня пасеўнага плану, а ў той-жа час такія рашаючыя калгасы, як імя Дзяржынскага—даў толькі 6,3 проц., а „Бальшавік"—23,2 проц.

Гэткае ганебнае становішча, правал усіх партыйна-ўрадавых тэрмінаў стварыўся вылючна з-за таго, што ў сельсавеце ні партэйка, ні сельсавет, ні брыгадзіры гарадзкіх ганізацый і ўстаноў не зламілі кулацкага батажу, не арганізавалі калгасьнікаў на дабязьлітаснага бою засеўшым у праўленьні лацкім дзяльцам—былым цьвёрдазаданьнікам, ія разам з кулаком, падтрыманым справамі обных аднаасобнікаў, пусьціўшыся ў спэкуляцыю, гаварылі аб сырасьці, аб немагчымасьці згортваць раньнюю сяўбу, цягнулі калгасы і лгасьнікаў да таго, каб сяўбу разгортваць лькі з „Міколы".

Аналізуючы становішча сяўбы па Рудніцм сельсавеце, нельга прайсьці міма абураюх фактаў насаджэньня ў калгасах розных ужбовых асоб, даходзячага па некаторых лгасах да таго, што там „семера з ложкай—адзін з сошкай". Прытрымліваючыся гэга кулацкага прынцыпу, накіраванага на збуреньне калгасу, праўленьне калгасу „Бальшавік" дапусьціла такое становішча, што на 5 мая ў калгасе было людзей, незанятых на полі і каля жывёлы 21 чал., а на полі прыдна такая ж колькасьць, тады калі 25 мая кані не працавалі ў полі. У гэтым калгасе, е і ў радзе іншых, брыгадзір ня ходзіць за плугам, ён больш падобны на рахункавода, мся на арганізатара брыгаднай работы. У тым-жа калгасе дзіцячая пляцоўка, дзе дзеці ычайна абасабляюцца ад кіраўніцтва, працуе ы чалавека, у сталоўках—4, акрамя загадчка МТФ—прыёмшчыка малака. У калгасе я Дзяржынскага сямейнасьць прымусіла двох аровых мужчын—Робэрта і Пятра Кучаравых паслаць у поле, а даць ім магчымасьць згульваць у чыне людзей па асобных дарунях для праўленьня і для сталоўкі. У калсе імя Войкава жыве і „здравствуе" у асноўм аслабанёны намесьнік старшыні калгасу, ў брыгадзе Сухоншчына нават дайшлі да го, што да брыгадзіра вызначаны спэцыяльы вучотчык, якому за гэта налічваюцца працадні. І бясспрэчна гэтае насаджэньне «начальства» мае свой адбітак ня толькі на абмежаванасьці рабочай сілы на ворыве, сяўбе і іных палявых работах, але значна адбіваецца а настроях калгасьнікаў, якія жадаюць быць калгасе, там працаваць і толькі бяз прыазчыка (у ролі апошняга моцна выступае непрацуючы, а бегаючы калгасны брыгадзір).

Пры такіх умовах, пры наліччы урокаў яўбы мінулага году, хлебазагатовак, пры наліччы па калгасах з 1937 гектар яравога кліу толькі 205, увянатых падзабліва, уздымаецца адказнасьць праўленьняў калгасаў, партыйай ячэйкі і сельсавету за посьпехі сяўбы 933 году. Партыйная ячэйка не зразумела, што ў першую чаргу посьпех сяўбы рашаецца д расстаноўкі сіл і ад таго, наколькі масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў ахопены палітычным узьдзейнічаньнем, наколькі высокая іх мабільнасьць. З 6-ці членаў ячэйкі толькі адзін кандыдат партыі Тамашоў зьяўляецца старшынёю калгасу імя Дзяржынскага. се пяць камуністаў сядзяць у памяшканьні сельсавету: Міхееў—старшыня савету, Юдзін—экратар сельсавету, Рудакоў—сэкратар партячэйкі, Таркоўскі—старшыня сельСТ і толькі яты—мэдычны фэльчар Бранштэтэр сядзіць а мэдпункце ў поўкілёмэтравай адлегласьці ад сельсавету. Гэтая даведка аб разьмеркаваньні сіл бясспрэчна сама сабою выкрывае прычыны такога ганебнага становішча ў калгасах. Камуністы і праўленцы калгасаў не арганізавалі сацыялістычнага спаборніцтва паміж калгасамі ўнутры іх. Тав. Тамашоў гаворыць аб выліку і аб тым, што нешта ня чутна было адказу. Недапісанай ляжала 27 мая сацумова паміж двума брыгадамі калгасу імя Войкава. Ні старшыня калгасу Рыжыкаў, ні брыгадзір гаркому партыі Брыкаў ня здолелі арганізаваць сапраўднае сацыялістычнае спаборніцтва паміж двума брыгадамі і таму сацумова далей 6-га пункту не напісана.

Ва ўсіх калгасах мы маем рашэньне аб выхадзе на работу з 4-х гадзін раніцы, але-ж у сапраўднасьці ні ў адным калгасе не пачынаюць палявых работ раней 6—6½ гадз., а ў калгасе імя Сталіна 25-га мая запраглі ў 11 раніцы і распраглі коняй а 9 гадз. увечары. 13 жанчын калгасу «Бальшавік» зьявіліся на работу а 6 гадз. 30 мін. і да 9 гадзін яны не працавалі таму, што іх брыгадзір садова-гародняй брыгады Якаўлеў не зьявіўся на работу па прычыне таго, што патрэбна было на другой брыгадзе быка загнаць у пуню, і пры такіх умовах калгасы Рудніцкага сельсавету 25, 26 і 27 мая, займаючыся ворывам, далі ў сярэднім на каня ў дзень 0,2 і 0,23 гэктара.

Праўленьні ўсіх калгасаў па сутнасьці тормазяць нагамі тыя заданьні на кожны дзень, якія да іх спускаюцца сельсаветам. Рудніцкая пасеўная гісторыя ня ведае ніводнага дня, у які было б выканана вытворчае заданьне, а, наадварот, 25 мая неў месца такі факт. Калгас „Бальшавік" атрымаў ад сельсавету дзённае заданьне пасеяць 32 гэктары. Старшыня калг. Сьпірыдонаў загадаў брыгадзіру брыгады № 1 Саладухіну засеяць 22 гэктары, у сваіх-жа намётках дацягваў да 10,5 га, а брыгадзір Саладухін намеціў сваё заданьне—4,33 га і ў рэзультаце брыгада № 1 25 мая абсемяніла толькі 2,5 га. 32—22—10,5—4,33 і 2,5 гэктара—вось арытмэтыка правалу веснавой сяўбы па калгасе «Бальшавік».

Па калгасе імя Дзяржынскага вялікую ўвагу заслугоўваюць дзьве супроцьлегласьці работы двох брыгад. Брыгада Саладухіна заканчвае ворыва і да 1-га чэрвеня скончыць сяўбу. Гэта таму, што брыгадзір Саладухін сам ходзіць за плугам, пасьпяваючы падлічыць, і зьвесткі даць, і з брыгадай пагутарыць. А ў брыгадзе, дзе быў брыгадзірам былы кандыдат партыі Саломенка, на сёньняшні дзень засталося ворыва амаль 60 гэктараў. На гэтых двох прыкладах відавочна вялічэзнейшая роля брыгадзіра—арганізатара работы, аспоўнай калгаснай адзінкі—вытворчай брыгады.

Такое становішча пераражывае Рудніцкі сельсавет, занесены на чорную дошку разам са сваімі кіраўнікамі, а сёньня разам са сваімі шэфамі. Задача сёньняшняга дню пазбавіцца дошкі ганьбы, выканаць плян веснавой сяўбы, што можна зрабіць толькі зламіўшы кулацкі сабатаж, па сутнасьці арганізаваны часткай калгасных праўленцаў, добрая частка якіх былыя цьвёрдазаданьнікі. Пазбавіцца дошкі ганьбы Рудніцкі сельсавет здолее толькі тады, калі ён сам, партячэйка, брыгадзіры з гораду разам з адданай партыі і савецкай уладзе часткай членаў праўленьняў калгасаў арганізуюць сапраўдную барацьбу за сяўбу ў калгасных брыгадах і па аднаасобным сэктары.

Дэлегаты Усесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў у сваёй адозьве да ўсіх сялян-калгасьнікаў пісалі аб тым, што зараз улада ўправе ад нас патрабаваць адказу. На многа большага адказу партыя і ўлада ўправе патрабаваць ад калгасьнікаў Рудакоўскага сельсавету. З 9-ці калгасаў тры калгасы маюць электрычнасьць, калгасы маюць сельска-гаспадарчыя машыны, вялікую колькасьць нядрэнай глебы, якую ім дала савецкая ўлада, вялікую колькасьць і кулацкіх і былых памешчыцкіх садоў і будынкаў перадала ўлада калгасьнікам Рудніцкага сельсавету. Ёсьць усе магчымасьці для таго, каб надаць вялічэзнейшы размах барацьбе за сваю ўласную заможнасьць. Рудніцкія калгасьнікі за гэта. Арганізаваць барацьбу за бальшавіцкія калгасы, за заможнасьць калгасьнікаў—абавязак рудніцкіх арганізацый, абавязак шэфаў, абавязак калгаснага актыву. Ня ў меншай ступені гэты абавязак усладаецца на працоўную інтэлігенцыю, тым больш, што ў Рудніцкім сельсавеце дзьве ШКМ і тым больш, што настэўнікі зараз на Рудніцах не адчуваюцца як моцная сіла.

Камуністы, камсамольцы, калгасны актыў Рудніцкага сельсавету! Посьпехі сяўбы выключна ў вашых руках, вы нясеце ў першую чаргу адказнасьць за лёс калгасаў, за лёс калгасьнікаў. Працуючы так, як перадавыя калгасы Віцебшчыны, як калгасы «Свабода», «МОПР» і іншыя, вы здолееце даць заможнае культурнае жыцьцё сотням калгасьнікаў.

СПАБОРНІЦТВА РАЁНАЎ НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЯЎБЫ.

(Ход сяўбы на 27 мая)

	ГОМЕЛЬСКІ	ВІЦЕБСКІ
Усяго засеяна .	89,2 проц.	46,5 проц.
Саўгасы і каапгасы	87,5 проц.	50,7 проц.
Калгасы	94,3 проц.	54 проц.
Аднаасобнікі . .	86,4 проц.	33,6 проц.

ХОД СЯЎБЫ ПА РАЕНЕ

па становішчы на 28 мая 1933 году.

Назва сельсаветаў і арганізацый	Трэб. было засеяць 27 мая (у га)	Засеяна ў га.	Проц. выкананьня агульнага плану.
Міхалёўскі	100	27	63,0
Машканскі	162	56	58,5
Замастоцкі	198,5	—	56,7
Ялагінскі	250,5	31	55,0
Віцебскі	176,5	13	50,6
Бараўлянскі . . .	184 5	32	50,6
Шумнянскі	242,0	23	50,1
Сялюцкі	165	—	49,7
В.-Лётчанскі . . .	166	6	47,8
Бабініцкі	274	33	46,0
Міхалаёўскі . . .	193	12	44 8
Старасельскі . . .	166,5	22	39,5
Рудакоўскі	311,0	10	35,9
Даўжанскі	180,7	34	33,8
Рудніцкі	313,5	3	32,1
Вайсковыя часьці .	—	12	59,2
Леспрамгас . . .	—	—	59,5
Разам па раёну .	3083,7	314	47,3

Увага: На 28 мая саўгасы засеялі 54,2 проц. пляну, каапгасы—49,6 проц., калгасы—54,5 проц., аднаасобнікі—35 проц. і калгасьнікі па неабагуленых гародах—19,9 проц. пляну.

СПАБОРНІЦТВА СЕЛЬСАВЕТАЎ НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЯЎБЫ.

(Ход сяўбы на 27 мая).

Замастоцкі 56,7 проц.	Машканскі 55,9 проц.
В.-Лётчанскі 47,4 проц.	Старасельскі 38,3 проц.
Бараўлянскі 48,9 проц.	Даўжанскі 31,8 проц.
Шумнянскі 49,8 проц.	Рудакоўскі 35,6 проц.

НА ШЛЯХУ ПЕРАМОГІ.

Чырвоны сьпіс даповніўся яшчэ адным вмагаром—калгасам «Чырвоны партызан», Замастоцкага сельсавету, старшынёй праўленьня якога зьяўляецца Ёлкін.

На 27 мая калгас выканаў агульны плян сяўбы на 105,5 процантаў, у тым ліку збожжавых культур засеяна 101,7 процантаў пляну, ільну—125 процантаў, віцы—193,8 проц. Звыш пляну засеяна таксама гародніны 1 га. Замест сілосных культур калгас засявае 2 га ячменю. Бульбы засеяна толькі 60 проц. пляну, але ўся зямля як пад бульбу, так і ячмень падрыхтавана ў патрэбнай колькасьці і да тэрміну, вызначанага гаркомам і гарсаветам—да 30 мая будзе засеяна поўнасьцю.

Зараз калгас пасылае буксірную брыгаду ў суседні адстаючы калгас „Вусьце".

Д.

ЧЫРВОНЫ СЬПІС

саўгасаў, калгасаў і вёсак, якія скончылі сяўбу.

Калгас „Свабода" (Старае Сяло), старшыня калгасу **Барысенка**.

Калгас імя 1-га мая (Сялюты), старшыня **Селязьнёў**.

Калгас імя МОПР (Сялюты), старшыня **Веташкоў**.

Саўгас „Лужасна", дырэктар **Марозаў**.

Калгас «Наер лябы» (Віцебскі сельсавет), старшыня **Фрэйдзон**.

Калгас „Індустрыя" (Бараўляны), старшыня—**Курыленка**.

Калгас „Новы сьвет" (Міхалі)—старшыня **Леонаў**.

Калгас „Заходняя Дзьвіна" (В.-Лётцы)—старшыня **Васілеўскі**.

Калгас „Чырвоны ўдарнік" (Ялагі)—старшыня **Мудрычэнка**.

Вёска Пракуды, Віцебскага сельсавету, член сельсавету—**Бараноўскі**.

Вёска Дзякі, таго-ж сельсавету, член сельсавету—**Упіт**.

Вёска Ляхава, Машканскага сельсавету, член сельсавету—**Грунтоў**.

Калгас «Чырвоны партызан» (Замасточча), старшыня **Елкін**.

Чорная дошка

сельсаветаў, калгасаў і вёсак, ганебна зрываючых сяўбу.

Даўжанскі сельсавет—старшыня сельсавету Гудаў, сэкратар Гарадзенкі, упаўнаважаны гаркому па калгасе «Сілач»—Кантаровіч.

Фабрыка „Дзьвіна"—шэф Даўжанскага сельсавету.

Калгас „В. Чэрніна", Замастоцкага сельсавету—старшыня Карчэўскі.

Дэпо Паўн.-Зах.—шэф калгасу „В. Чэрніна".

Калгас імя Левіна Бараўлянскага сельсавету—старшыня Чэпеленка.

Калектыў Водаканалу—шэф калгасу імя Леніна.

Рудніцкі сельсавет: старшыня сельсавету—Міхееў, сэкратар партячэйкі—Рудакоў. Упаўнаважаны ГК па калгасе імя Войкава—Брыкаў.

Шэфы калгасаў Рудніцкага сельсавету—сьпіртзавод, фабрыка гнутай мэблі, Белэнэрга, саюз грамадзкага харчаваньня, арцель «25 кастрычнік».

Рудакоўскі сельсавет: старшыня сельсавету—Кэрбель, сэкратар партячэйкі—Мінакоў, упаўнаважаны ГК—Зіноўеў.

Фабрыка «Прафінтэрн»—шэф сельсавету.

Кандыдаты на чорную дошку.

За зрыў веснавой сяўбы, за ігнараваньне дырэктыў партыі і ўраду аб падняцьці ўраджайнасьці заносім кандыдатамі на чорную дошку:

Старасельскі сельсавет—старшыня Аржавоўскі, сэкратар—Саламонік, упаўнаважаны ГК—Гарэлік.

Калгас імя Чарвякова, Віцебскага сельсавету—старшыня Дзітлёнак, сэкратар партячэйкі калгасу Сысоеў.

Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта.

У СЯЛЮТАХ НАЎМЫСЬЛЯ ЗАЦЯГВАЮЦЬ СЯЎБУ.

Каб не аказаць дапамогі адстаючым калгасам, старшыні калгасаў «1 мая» і імя Калініна—Селязьнёў і Разумоўскі арганізавалі ў сваіх калгасах сабатаж. Мы патрабуем прыцягнуць іх да самай суровай адказнасьці. Ня можа быць літасьці да людзей, робячых справу клясавага ворага.

Сялюцкі сельсавет на 25 мая выканаў 47,2 проц. пляну веснавой сяўбы.

Замест сапраўднай мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў на выкананьне пляну ў тэрмін—злачыннае зьніжэньне тэмпаў сяўбы.

Сельсавет займаецца выключна фіксацыяй фактаў злачыннай бязьдзейнасьці паасобных старшынь калгасаў, паасобных членаў сельсавету. Нічога канкрэтнага ня робіцца, каб даць па заслугах зрыўшчыкам сяўбы, каб уняць разьюшаных кулацкіх агэнтаў, раней крычаўшых: „сеяць рана, гразна, шкодна", а цяпер адшукаўшых новыя прычыны, для зрыву сяўбы: „коні паслабелі, патрэбен выходны дзень, патрэбна ўперад засеяць свае гароды".

Цяпер, калі дорага кожная мінута, калі ўпушчаны ўсе тэрміны, патрэбна пачынаць работу разам з золакам і канчаць з заходам сонца, як гэта звычайна робіцца ў сельскай гаспадарцы. У Сялюцкім-жа сельсавеце робіцца наадварот.

Вось, напрыклад, адзін дзень—21-га мая. У гэты дзень усяго па калгасах сельсавету засеяна толькі 30 га, прычым калгасы імя 1-га мая, імя Левіна і імя Сталіна ў гэты дзень нічога не сеялі.

Аднаасобнікамі засеяна за дзень усяго 19,55 га. Разам па сельсавету засеяна 49,65 га, альбо 48 проц. штодзённага заданьня.

Што-ж робіцца на палёх?

Калгас імя 1 мая—старшыня Селязьнёў—павінен быў у гэты дзень скончыць пасадку бульбы, а пасьля аказаць дапамогу калгасу імя Варашылава, але-ж Селязьнёў злачынствуе, ён абвяшчае выходны дзень.

Калгас імя Калініна—старшыня Разумоўскі—меў усе магчымасьці скончыць сяўбу і аказаць дапамогу калгасу імя Карла Маркса. Але ў брыгадзе Сабецкага на работу ў поле выходзяць а 8-й гадзіне (і гэта сыстэматычна, як правіла), каб зацягнуць сяўбу, каб не дапамагчы калгасу імя Карла Маркса. На другі дзень 22 мая калгасьнікі гэтай брыгады за конямі пайшлі толькі а 7-й гадзіне. Людзі таўкуцца ўбеспарадку, ня ведаюць, што сёньня будуць рабіць. А 9-й гадзіне хто на полі работае, а хто яшчэ толькі з плугам выяжджае.

На бульбяным полі жанчыны чакаюць пакуль прывязуць бульбу. „Прывязьлі бульбу—няма пахара, а ўжо больш 8-мі гадзін". Пасадка пад маркер ігнаруецца. Старшыня Разумоўскі і брыгадзір Сабецкі сядзяць спакойна ля заваліцы, чакаюць пакуль калгасьнікі зьбяруць з поля коняй, льлюць кракадзілавы сьлёзы і займаюцца прама-такі шкодніцкімі разважаньнямі: «нашы коні паслабелі, прысталі, ня могуць работаць» І гэта ў той час, калі ў калгасе коні лічацца лепшымі па сельсавету і хлеба самая лепшая, самая сухая.

Патрэбна рашучая барацьба з кулацкімі агэнтамі, рознага роду ныцікамі, накшталт Разумоўскіх, Сабецкіх, Селязьнёвых і Байковых, каб ажыцьцявіць лёзунг правадыра партыі тав. Сталіна: падняць ураджайнасьць калгасных палёў, зрабіць калгасьнікаў заможнымі.

Ворагаў, зрываючых сяўбу—да суровай адказнасьці. Ніякай ім літасьці—бо далейшае зацягваньне сяўбы б'е па ўраджайнасьці сацыялістычных палёў.

Сіпко.

31 мая 1933 г., а 6-й гадзіне ўвечары, у вялікай залі гаркома КП(б)Б склікаецца АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТАКТЫВУ ПА ПЫТАНЬНІ ЧЫСТКІ ПАРТЫІ.

Дакладчык т. САХАРАВА.

На сход павінны зьявіцца: члены ЦК і ЦКК, гаркома, гарКК КП(б)Б, гаркома ЛКСМБ, партыйцы, сэкратары парткалектываў і ячэек, члены бюро ячэек, загадчыкі ўстаноў, члены фракцый гарсавета і гарпрафсавета.

Пропускі сэкратары парткалектываў і ячэек атрымоўваюць у гаркоме КП(б)Б (пакой № 15).

ГАРКОМ КП(б)Б.

АБ СТАНОВІШЧЫ Ў ШУМНЯНСКАЙ ПАРТ'ЯЧЭЙЦЫ.

Пастанова бюро ГК КП(б)Б ад 29 мая.

У сувязі з яўна апартуністычнымі устаноўкамі, праводзімымі сэкратаром шумнянскай сельпарт'ячэйкі Бялявым, які ня толькі ня прымае ніякіх мер па паскарэньні тэмпаў сяўбы, але сам агітуе аб немагчымасьці завяршэньня сяўбы ва ўстаноўленыя партыяй тэрміны („Так сеяць немагчыма", «Не справімся», «Нічога ў нас ня выйдзе»),—бюро ГК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Зьняць тав. Бялявы з работы сэкратара сельпарт'ячэйкі, перадаўшы справу аб яго партыйнасьці на разгляд парткалегіі.

2. Часова, да падбора сталага работніка, сэкратаром ячэйкі раіць тав. Гаўскага—упаўнаважанага ГК па Шумнянскім сельсавеце.

3. Папярэдзіць старшыню камуны «Іскра Ленінская» тав. Яскіна, што калі з яго боку ня будуць прыняты безадкладныя меры барацьбы з супраціўленьнем хуткім тэмпам сяўбы і ня будзе завершана сяўба па камуне да 1 чэрвеня, гарком паставіць пытаньне аб яго партыйнасьці.

Сэкратар гаркому КП(б)Б Міцькоў.

ЗАЎТРА, А 7-й ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ, У ВІЦЕБСК ПРЫБЫВАЕ КАЛЁНА ЎСЕСАЮЗНАГА АЎТАПРАБЕГА ДЫНАМАЎЦАЎ. АРГАНІЗУЕМ СУСТРЭЧУ БАРАЦЬБІТОМ ЗА РАЗЬВІЦЬЦЁ САВЕЦКАГА АЎТАСПОРТА.

ПАПЯРЭДАДНІ ЧЫСТКІ ПАРТЫІ.

Арганізацыя бальшавіцкай падрыхтоўкі і правядзеньне самой чысткі — ганаровая задача кожнага парткалектыва, ячэйкі і камуніста.

МАКСЫМАЛЬНА СКАРЫСТАЦЬ ЗАСТАЎШЫЯСЯ ДНІ.

Мінула больш як чатыры месяцы з таго часу, як студзеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК зацьвердзіў пастанову Палітбюро аб чысткі радоў партыі, якая павінна аслабаніць нашу партыю ад чуждых, прымазаўшыхся, абюракраціўшыхся і разлажыўшыхся элементаў, каб наша партыя змагла з яшчэ большай энэргіяй змагацца за пабудову бясклясавага грамадзтва ў другой пяцігодцы.

Ня гледзячы на такі доўгі тэрмін, працоўшы са дня апублікаваньня пастановы аб чысткі, ня гледзячы на правядзеньне гарконам нарады сэкратароў ячэек і парткалектываў яшчэ у сакавіку і сходу партактыву—8 мая, значная частка парткалектываў і, асабліва, партячэек не скарысталі гэты час для падрыхтоўкі да чысткі, для мабілізацыі рабочых мас на выкананьне прамфінпляну, і пляну сяўбы, для ўзьнаўленьня авангардзкай ролі камуніста на фабрыцы, заводзе, у калгасе, саўгасе і каапгасе. Аб гэтым сьведчаць прарывы ў прамфінпляне па радзе буйнейшых прадпрыемстваў гораду, аб гэтым сьведчаць прарывы ў пасеўнай кампаніі.

Задачы чысткі і партыйныя рашэньні па гэтым пытаньні некаторымі партячэйкамі яшчэ не даведзены да рабочых і калгасьнікаў і знайшліся такія ячэйкі, дзе аб чысткі не гаварылася нават на партыйных сходах (дрожджазавод—сэкратар ячэйкі Сівец, піўзавод—сэкратар ячэйкі Трубнікоў, ячэйка аўтабазы). У некаторых парткалектывах абмежаваліся толькі тым, што прапрацавалі рашэньне ЦК аб чысткі партыі, прынялі гэту пастанову «да ведама», чым па сутнасьці выхаласьцілі палітычнае значэньне чысткі (акулярная, шчацінны камбінат, фабрыка імя Клары Цэткін). Па ячэйцы МТС, якая павінна была скарыстаць падрыхтоўку да чысткі для выкананьня пляну сяўбы, рашэньне ЦК не прапрацавана па тых «матывах», што зараз яны заняты сяўбой. Апартуністы—члены бюро ячэйкі МТС не зразумелі, што чыстку трэба іменна ўвязаць з задачамі сяўбы, што партыя будзе разглядаць работу ячэйкі, работу кожнага камуніста паасобку—іменна па рэзультатах іх работы.

Па многіх партячэйках ня складзены і не абгавораны характарыстыкі партыйцаў (піўзавод, дрожджазавод, аўтабаза), а ў некаторых мясцох гэта зрабілі фармальна, не канкрэтна (дэпо трамваю). Па парткалектывах „Прафінтэрн", фабрыкі імя Клары Цэткін, шчацінная камбінату, «Чырвонага мэталіста» ня складзены яшчэ характарыстыкі членаў бюро цэхавых ячэек.

Падрыхтоўка да чысткі партыі некаторымі ячэйкамі і парткалектывамі не скарыстана для ўзмацненьня партдысцыпліны, у прыватнасьці, у галіне выкананьня элементарнага абавязка кожнага камуніста—уплата членскіх узносаў. Па ячэйцы аўтабазы маецца запазычанасьць за некаторымі членамі партыі больш, як за 10 месяцаў (Бурцаў і Уркевіч); па фабрыцы імя Клары Цэткін 44 чал. не плацілі членскія ўзносы больш як па 3 месяцы, 8 чал. не плацілі нават за цэлы год; па шчоткамбінаце 26 чал. не плацілі членскіх узносаў больш як 3 месяцы, а 5 чал. нават за паўтара года.

Гэтыя парткалектывы і ячэйкі не зразумелі і ня выканалі пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), «арганізаваць справу чысткі партыі такім чынам, каб забясьпечыць у партыі жалезную пралетарскую дысцыпліну і ачышчэньне партыйных радоў ад усіх ненадзейных, няўстойлівых і прымазаўшыхся элементаў». Яны не зразумелі паказаньні Леніна, які гаварыў: «Хто хоць колькі небудзь аслабляе жалезную дысцыпліну партыі пралетарыяту (асабліва ў час яго дыктатуры), той фактычна дапамагае буржуазіі супроць пралетарыяту».

Ня ўсюды яшчэ і пасьля сыгналаў «Правды» наладжаны вучот камуністаў. Так на піўзаводзе выключылі аднаго з партыі больш як год таму назад і да гэтага часу няма аб гэтым пастановы. Да гэтага часу ў ячэйцы піўзаводу маецца кандыдат партыі з 1929 г., які разлагае сваімі заводзінамі і контррэвалюцыйнымі разгаворамі рабочую масу, а сэкратар ячэйкі заяўляе: „Пачакаем да чысткі і камісія яго выключыць з партыі".

Побач з незадавальняючай падрыхтоўкай да чысткі асобных парткалектываў і ячэек, маецца значная частка партыйных калектываў і ячэек, якія па-сапраўднаму ўзяліся за партработу, за ўзьняцьцё марксыцка-ленінскай вучобы, за павышэньне авангардзкай ролі камуніста на вытворчасьці (скурзавод, «Прафінтэрн», саюзтранс і інш.). Значна павысіліся запатрабаваньні да ўзьняцьця свайго палітычнага ўзроўню партыйцамі многіх ячэек і парткалектываў, арганізаваны рад гурткоў па вывучэньні статуту і праграмы партыі (дэпо трамваю, хлебазавод, ячэйка сувязі і інш.). На заводзе „Чырвоны мэталіст", дзе значная частка членаў і кандыдатаў партыі раней зусім ня вучылася, зараз, у сувязі з падрыхтоўкай да чысткі, арганізаваны сэмінары, якія наведвае больш як 70 партыйцаў.

Засталіся лічаныя дні. Партыйная арганізацыя павінна напружыць сваю работу з тым, каб падыйсьці да чысткі партыі з поўным выкананьнем прамфінпляну, асабліва па яго якасных паказчыках, і скончыць сяўбу, мабілізаваць усе сілы і паставіць палітмасавую работу так, як гэта было ў час правядзеньня падпіскі на пазыку.

Максымальна скарыстаць застаўшыяся дні для арганізацыі рабочых мас, «забясьпечыць удзел усіх адданых сацыялістычнаму будаўніцтву беспартыйных рабочых, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў» — баявая задача партарганізацыі.

Пімштэйн.

ШТО ЧЫТАЦЬ АБ ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ.

1. Пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чысткі партыі ў 1933 годзе («Правда» ад 29 красавіка і «Віцебскі пралетары» ад 4 мая, № 101).
2. Ленін—„Вялікі пачын" (т. VI, стар. 241—261, выд. 1-е, 1925 г., т XXIV, стар. 325, выд. 2-е, 1930—32 г. г.).
3. Ленін—„Аб чысткі партыі"—артыкул, апублікаваны ў «Правде» ў 1921 г. (т. XVI, ч. 1 я, стар. 331—333, т XXVII, стар. 12, выд. 2-е 1930—32 г. г.).
4. Ленін—«Прамова на пасяджэньні камуністычнай фракцыі ўсесаюзнага зьезду мэталістаў 6 сакавіка 1922 г.» (т. XVIII, ч. 2-я, стар. 15—16, выд. 1-е, 1925 г., т. XXVII, стар. 168, выд. 2-е, 1930—32 гг.).
5. Сталін—«Аб асновах ленінізму» (асобна разьдзелы VIII і IX, «Стыль у рабоце»).
6. «Аб чысткі членаў і кандыдатаў УсеКП(б)»—рэзалюцыя, прынятая XVI партканфэрэнцыяй у красавіку 1929 г. (стэнаграфічная справаздача аб канфэрэнцыі, выд. 1929 г.).
7. „Партыя прыступае да чысткі сваіх радоў" (перадавы артыкул у „Правде" ад 30 красавіка, № 119).
8. Е. Яраслаўскі—„За глыбокую праверку і чыстку радоў партыі" (артыкул у „Правде" ад 6 мая 1933 г.).
9. Рэзалюцыя студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК аб чысткі УсеКП(б).
10. Інструкцыя аб чысткі Цэнтральнай камісіі па чысткі УсеКП(б) („Правда" ад 20 мая г. г. і „Віцебскі пралетары" ад 22 мая № 116).
11. „Мабілізуем масы на актыўнае правядзеньне чысткі" (перадавы артыкул у „Рабочей Москве" ад 14 мая).

ДА КАНФЭРЭНЦЫІ КУЛЬТАРМЕЙЦАЎ.

На фронце ўсенавучу становішча трывожнае.

Яшчэ 17-га сакавіка бюро гаркому КП(б)Б, заслухаўшы пытаньне аб ліквідацыі малапісьменнасьці і рэштак няпісьменнасьці, вынесла максымальна канкрэтную пастанову, у якой запісаны даты, час, у які патрэбна работу разгарнуць, прозьвішчы і імёны людзей, якія адказваюць за справу. Але гэтая пастанова ня выканана і на сёньня мы на вучастку ўсенавучэ маем ганебнейшыя прарывы, віноўнікі якога павінны трымаць адказ перад партыяй за невыкананьне дырэктыў гаркому.

На фабрыцы „Дзьвіна"

звыш 540 малапісьменных рабочых і досыць многа няпісьменных. Пры такой наяўнасьці малапісьменных усеагульнае навучаньне набывае асабліва вострае значэньне, але на справе гэты вучастак у рабоце партыйнай, прафсаюзнай, камсамольскай і грамадзкіх арганізацый займае апошняе месца.

Адміністрацыя фабрыкі забясьпечыла школу сродкамі, памяшканьнем, але арганізацыі фабрыкі нічога не зрабілі для прыцягненьня да заняткаў рабочых і зараз школа зусім не ўкамплектавана. Фармальна па першаму канцэнтру ахоплена вучобай 272 чалавека, фактычна-ж наведваюць заняткі 98 чал. Арганізаваны групы на яўрэйскай і польскай мовах, але ў гэтых групах займаецца 2 слухачы. На фабрыцы работае многа украінцаў, сярод якіх маюцца малапісьменныя і няпісьменныя, работы сярод іх ніякай не праводзіцца. Аддзяленьне школы, якое было арганізавана для абслугоўваньня рабочых, што жывуць у інтэрнатах пасёлку імя 1 га мая, распалася.

Аб чым кажуць гэтыя факты? Яны гавораць аб тым, што арганізацыі фабрыкі навучаньнем дарослых ня цікавяцца. Ёсьць дзьве пастановы агульных сходаў, дзьве пастановы фабкому аб наладжваньні работы па ўсенавучу дарослых, але гэтыя пастановы засталіся на паперы.

Адкрыты ліст актыву школы да арганізацыі фабрыкі, зьмешчаны ў шматтыражцы яшчэ у сьнежні мінулага году, у якім рабочыя прасілі пасьліць увагу да ўсенавучэ, як аднаго з важнейшых вучасткаў культурнага будаўніцтва, не пачуты. Ніхто на фабрыцы не знайшоў патрэбным нават адказаць на ліст.

Фабком, і ў прыватнасьці культработнік тав. Шыф, не займаецца пытаньнем усенавучэ. Актыў культсэктару і культармейцы не мабілізаваны на гэтую справу, ніхто з культработнікаў фабрыкі ні разу ня быў у школе.

„Калі зьвернешся да сэкратара парткалектыву тав. Вэксьлера—піша ў «Віцебскім пралетары» тав. Пэтэрсон—то замест таго, каб атрымаць дапамогу, замест чулага падыходу да справы, атрымоўваеш адказ: „самі вы і валы настаўнікі нічога ня робіце, а чакаеце, пакуль за вас зробяць". Пасьля такога адказу няма ахвоты зварачвацца да адказных работнікаў. Нядбайныя адносіны з боку кіраўнікоў спрыяюць разважаньням сярод адсталай часткі рабочых, што справай вучобы зацікаўлены выключна настаўнікі, бо яны за гэта атрымліваюць пэнсію.

Сярод партыйцаў фабрыкі—42 малапісьменных. Яны ўсе як адзін абавязаны былі зьяўляцца ўдарнікамі фронту ўсенавучэ, а між тым на самай справе толькі адзінкі з іх наведваюць школы. Камсамольцы таксама не навучаюцца, а калектыў камсамолу нават ня ведае, колькі на фабрыцы малапісьменных камсамольцаў.

На чыгуначным вузьле

нават ня маюць вучоту няпісьменных і малапісьменных. Платныя настаўнікі (якіх, дарэчы, на чыгунцы не мала) нічога ня робяць, а рабочыя ходзяць і шукаюць школы. Сталы платны інструктар—мэтодыст Васэрман толькі таго і ведае, што атрымоўваць заробак.

Тав Гаршкоў—загадчык культаддзелам райпрафсаюзу—не жадае нічога рабіць па ўсенавучу. У пастанове СНК ясна сказана, што дырэкцыя прадпрыемстваў павінна весьці стэлы вучот няпісьменных і малапісьменных і несьці адказнасьць за гэтую справу. Начальства чыгункі прыкідваецца, што яны быццам нічога ня ведаюць, што гэта за ўсенавуч дарослых, пастанову партыі і ўраду па гэтым пытаньні яны ня чытаюць і ведаць не жадаюць.

Старшыня фабкому

фабрыкі „Прафінтэрн"

тав. Пейсаховіч лічыць усенавуч не сваёй справай і калі да яго зьвярнулася брыгадзір тав. Майорава, то ён адаслаў яе да тав. Гадаскінай, а калі Майорава зацікавілася, што ён як старшыня зрабіў для таго, каб узьняць работу па ўсенавучу, Пейсаховіч патрабаваў „мандат" на права такіх запытаньняў. Гэта не анэкдот, а жывая сапраўднасьць, якая з усёй глыбінёй паказвае агідныя адносіны Пейсаховіча да ўсенавучу.

Гарком КСМ

дагэтуль ня выканаў паказаньняў гаркому партыі: не распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па ўдзелу камсамольскай арганізацыі ў справе ўсенавучэ моладзі, асабліва дапрызыўнікаў, ня вылучана сталая колькасьць культармейцаў па кожнаму калектыву і ячэйцы. А камсамольскія ячэйкі на прадпрыемствах па ўсенавучу нічога ня робяць. Так, напрыклад, камсамольцы фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі" парашылі разгарнуць работу па ўсенавучу. Парашылі—запісалі, запісалі... і забыліся. На заводзе «Чырвоны мэталіст» малапісьменныя камсамольцы зусім не наведваюць заняткаў. А на фабрыцы «Дзьвіна» калектыў камсамолу пальцам аб палец не паварушыў нават для таго, каб устанавіць, колькі-ж у арганізацыі налічваецца малапісьменных камсамольцаў.

Так далей працягвацца ня можа. Камсамольская арганізацыя—шэф усенавучэ. Калектывы, ячэйкі і ў першую чаргу бюро гарадзкога камітэту камсамолу павінны несьці строгую адказнасьць за ўсенавуч.

У сьпісу бязьдзейнікаў па ўсенавучу не апошняе месца займае

Гарком саюзу працасьветы,

які літаральна нічога на гэтым адказьнейшым вучастку ня робіць. Ён супакоіўся на тым, што школы прымацаваны да прадпрыемстваў і што асобныя настаўнікі гэтую работу праводзяць. Ён нават не паклапаціўся склікаць нараду культармейцаў—настаўнікаў па пытаньням усенавучэ.

ГарАНА

для правядзеньня ўсенавучэ ўтрымоўвае штат работнікаў. Мы пытаемся, чым гэтыя работнікі заняты? Чаму яны ня выконваюць сваіх абавязкаў?

„На ліквідацыю няпісьменнасьці па аднаму В.-Лётчанскаму сельсавету за час з 1 лістапада па 1 красавіка выдаткавана 1886 руб. 12 к." —так значыцца па дакументах гэтага сельсавету. А на справе што мы маем? На справе па сельсавету работае толькі адзін лікпункт, які ахоплівае 4-х няпісьменных. Неаднаразова ў гэты сельсавет выяжджалі інспэктары гарАНА, але нічога канкрэтнага яны там не зрабілі. Сваёй сьлепатой і нядбайнасьцю яны толькі спрыялі таму, каб Харкоўская—інструктар лікпункту—растранжырвала сродкі.

Тав. Чарняк—старэйшы інспэктар палітасьветы больш займаецца парадным шуміхай чымся работай. Яна толькі і ведае, што складаць зводкі.

Характэрнай рысай работнікаў гарАНА зьяўляецца тое, што яны заўжды змахіваюць «віну» з сябе. Пагаварыце з Чарняк і вы атрымаеце адказ, што: «наогул на гэтым вучастку ў нас усё хадна, а там, дзе навучаньне слабавата, вінаваты арганізацыі мясцовыя, усе хто хочаце, толькі не інспэктура».

* * *

Да ліквідацыі рэштак няпісьменнасьці і малапісьменнасьці павінна быць прыкована ўвага ўсяе грамадзкасьці гораду і раёну. Гарпрафсавет, гарАНА, фабзаўмясцкомы, партыйныя і камсамольскія ячэйкі, грамадзкія арганізацыі, культармейцы, настаўнікі наш бальшавіцкі друк абавязаны неадкладна ўзяцца за справу, і дабіўшыся, каб Віцебшчына, адна з першых па БССР стаўшая суцэльна-пісьменнай, на працягу бліжэйшага часу зьявілася перадавым ачагом усеагульнага навучаньня дарослых.

Арлоўскі.

Аб барацьбе са шкоднікам жывёлагадоўлі—аваднём.

Абавязковая пастанова віцебскага гарадзкога савету ад 15-га мая 1933 г. № 14|130.

У мэтах змаганьня са шкоднікам жывёлагадоўлі—аваднём, віцебскі гарадзкі савет, на падставе пастановы СНК БССР ад 3-га мая 1933 г. за № 616, ПАСТАНАЎЛЯЕ.

1. Абавязаць кіраўнікоў саўгасаў, калгасаў, каапгасаў і аднаасобныя гаспадаркі ў перыяд да 15 га чэрвеня г г. пад кіраўніцтвам віцебскай машынна зьнішчальнай станцыі і райвэтінспэктара, правесьці 100-проц апрадоўку ўсяго пагалоўя буйнай, рагатай жывёлы ад скурнага авадня.

2. Да ўдзелу ў барацьбе з аваднём прыцягнуць увесь ветарынарны, агранамічны і зоотэхнічны персанал.

3. Кожнаму калгасу, саўгасу, каапгасу і сельсавету вылучыць адказнага працаўніка па правядзеньні працы па барацьбе са скурным аваднём.

4. Адказнасьць за поўнае правядзеньне барацьбы са шкоднікамі жывёлагадоўлі ўскласьці на дырэктароў саўгасаў, каапгасаў, старшынь калгасаў і старшынь сельсаветаў—па аднаасобнаму сэктару.

5 Асобы, вінаватыя ў невыкананьні гэтай абавязковай пастановы, прыцягваюцца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку,—штрафу да 100 руб., альбо прымусовым работам да 15 дзён.

6. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на сельска-гаспадарчы адзел гарсавету, рабоча-сялянскую міліцыю і МЗС.

7. Гэтая абавязковая пастанова ўваходзіць у сілу з дня яе апублікаваньня.

Старшыня гарсавету Кардашэнка.
За сэкратара гарсавету Багданаў.

ПАЗЫКА „ПЕРШАГА ГОДУ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ".

ЗЬМЯНШАЦЬ СУМУ ПАДПІСКІ—ЗЛАЧЫНСТВА ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ.

НЕ ДАПУСКАЦЬ ЗЬНІЖЭНЬНЯ СУМЫ ПАДПІСКІ.

Адзін з галоўных, рашаючых вучасткаў пазыковай кампаніі—гэта афармленьне падпіскі. Мала правесьці падпіску, для пасьпяховага правядзеньня кампаніі неабходна добрае афармленьне яе. І вось тут, у час афармленьня рад калектываў пачынае даваць зьніжаныя заяўкі. Гэта значыць, што пры дачы зьвестак аб ходзе падпіскі заяўка была больш вялікая, а пры афармленьні падпіскі па купюрах падпіска зьніжаецца. Гэта зьявішча бязумоўна ненармальнае і яго трэба зараз-жа ліквідаваць.

Ні адзін калектыў ня мае права і не павінен зьніжаць сваёй заяўкі. Мы ня маем ніякага права зьніжаць суму падпіскі, бо гэтым мы ўрываем ад дзяржавы пазычаныя ёй працоўнымі грошы.

Друкуемы сёньня выбарачны сьпіс калектываў, якія зьменшылі заяўкі, павінен быць суровым папярэджаньнем усім астатнім, прыступаючым да афармленьня падпіскі. Мы патрабуем ад калектываў, якія зьнізілі заяўкі, неадкладнага разгорваньня дадатковай падпіскі і стопроцантнага ахопу ўсіх працуючых з тым, каб ні ў якім разе не дапускаць зьніжэньня сумы падпіскі.

СЬПІС калектываў, якія зьменшылі свае першаначатковыя заяўкі.

Назва калектыву	Першапачатковая заяўка	Заяўка пры афармленьні	Зьмяншэньне
Завод „Камінтэрн"	42.550	42.060	490
ФЗВ мэталістаў	24.200	23.805	395
ЗРК фабрыкі „Прафінтэрн"	3.365	2.930	435
Дрожджазавод	12.075	11.760	315
Заразная больніца	10.645	10.445	200
Амбуляторыя імя Калініна	12.000	11.410	590
Архіў	2.965	2.620	345
Пабудова маста	21.260	21.000	260
Арцель „Чырвоны Кастр."	7.990	7.615	375
Яські ізалятар	1.615	1.470	145

Распачалі работу.

На фабрыцы «Прафінтэрн» арганізавана брыгада „сацзаслона" з ударнікаў-фінармейцаў, рабкораў, якая канкрэтна ўзялася за работу па ахопе рабочых, зварочваючыхся з дамоў адпачынку, курортаў і ўноў уліўшыхся на фабрыку падпіскай на пазыку і дапамагае бліжэйшаму ЖАКТ'у ў выкананьні заданьня па пазыцы.

Шматтыражка „Прафінтэрнавец".

Сёньня грамадзкі прагляд новай пастаноўкі БДТ-2.

АБ „ЖАНІЦЬБЕ ФІГАРО" І ЯЕ ПАСТАНОЎЦЫ.

Камэдыя „Жаніцьба Фігаро" напісана Бомаршэ ў 1781 годзе, але на сцэне яна зьявілася толькі ў 1784 годзе. Пра тое, наколькі гэтая камэдыя выяўляла тагочасныя рэвалюцыйныя настроі, яскравей усяго сьведчаць словы Людовіка XVI у часе чытаньня п'есы: „Гэта агідна... Гэтага ніколі ня сыграюць: трэба зруйнаваць Бастылію, інакш паказ п'есы будзе небясьпечнай непасьлядоўнасьцю. Гэты чаланек кпіць з усяго, што павінны паважаць у дзяржаве..."

І сапраўды, лёгкая на першы погляд камэдыя была буйным заклікам да зьвяржэньня існаваўшага дзяржаўнага ладу, выяўляла рэвалюцыйныя настроі лепшых прадстаўнікоў тагочаснай буржуазіі, якая толькі яшчэ ўздымалася на змаганьне з аджываючым феадалізмам.

Зьмест п'есы вельмі нескладаны. Лёкай графа Альмавіво—Фігаро імкнецца ажаніцца з пакаёўкай графіні—Сюзаннай. Разбешчаны граф хоча мець Сюзанну сваёй каханкай, але, калі пераконваецца, што яго жаданьні ня выклікаюць пачуцьцяў пакаёўкі, імкнецца перашкодзіць шлюбу. Аднак, лоўкі Фігаро і яго нарочаная Сюзанна шляхам усялякіх хітрыкаў і маскаваньняў абдурваюць графа і перамагаюць яго. Гэты нескладаны зьмест разгорнуты ў вельмі складанай і заблытанай фабуле: поруч з асноўнай інтрыгай столькі паўзьбочных, што сама пабудова твору прымушае з узрастаючай зацікаўленнасьцю сачыць за разгортваньнем дзеі.

Але галоўнае ў п'есе—гэта сарказм Бомаршэ, з якім ён злосна кпіць і з феадальнага дваранства, і з тагочаснага суду, і з усіх праяў сацыяльнага жыцьця перадрэвалюцыйнай Францыі. Гэты сарказм, гэтая сацыяльная каштоўнасьць твору прымусілі калектыў БДТ-2 спыніць сваю ўвагу на «Жаніцьбе Фігаро» пры падборы клясычнай п'есы для пастаноўкі.

Калектыву БДТ-2 не ўпершыню працаваць над клясыкай, але ранейшыя спробы («Бахханкі», „Сон у летнюю ноч") былі зьясьлаўлены і ніякрытычным падыходам да падбору матэрыялу і дробнабуржуазнай ідэалізацыяй клясычнай спадчыны, і хваравітым эстэтызаваньнем. Гэтыя памылкі мінулага прымушаюць і ўвесь калектыў і мастацкае кіраўніцтва тэатру з асаблівай увагай і настарожанасьцю падыходзіць да працы над „Жаніцьбай Фігаро".

Тэатр ставіць сваёй мэтай выявіць сацыяльную сутнасьць твору і, выяўляючы яе, даць сваю ацэнку, выявіць свае адносіны—адносіны савецкага тэатру—да эпохі, да клясы, якая сёньня канае ў корчах крызісу, але ў той час была маладой, гістарычна прагрэсыўнай клясай.

У вобразе гэроя камэдыі—Фігаро аўтарам выяўлена амаль усё так званае „третье сословие", амаль з усімі яго унутры-клясавымі супярэчнасьцямі (ролю рыхтуе актор А. Ільліскі). І самая цяжкая і складаная, але разам з тым і вельмі ўдзячная задача, якая стаіць перад авторамі і перад рэжысурай,—гэта здолець выявіць тыя парасткі сацыяльнай хваробы, што ўжо ў той час было заложана ў маладой клясе і што па меры яе росту прывяло до струхненьня, прывяло да таго заняпаду, у якім сёньня яна знаходзіцца.

П'еса перакладзена на беларускую мову А. Дударом, інтэрпэляцыі М. Ільліскага.

Ставіць п'есу рэжысэр тэатру ім. Вахтангава поэт П. Антакольскі, пры рэжысэрскай дапамозе мастацкага кіраўніка БДТ 2 М. Мінкевіча.

Пастаноўка вызначаецца ў рэалістычным пляне з невялікімі прапластваньнямі чыстай тэатральнасьці. Афармляе паказ мастак Г. Гольц, музыка кампазытара В. Оранскага. Танцы ў пастаноўцы К. Аляксютовіча.

М. Б.

У сувязі з зацяжкай веснавой сяўбы па Віцебскім раёне, прызначаны на 1 чэрвеня г.г.

пленум гарсавету пераносіцца на 5 чэрвеня.

Пленум пачнецца а 6-й гадзіне ўвечары 5 чэрвеня ў памяшканьні Палаца працы (пакой № 11).

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

5-га чэрвеня адкрыцьце ГАСТРОЛЯЙ РУСКАЙ ДРАМЫ Смаленскага гартэатру Н. Пагодзін

„МОЙ ДРУГ"

у 3-х дзеях, 15 карц.

Па калектыўных ЗАЯЎКАХ СКІДКА 20 проц. МЭТАВЫЯ спэктаклі СА СКІДКАЙ 35 проц ЗАЯЎКІ прымаюцца ў КАСЕ ТЭАТРУ. Білеты прадаюцца з 30 га МАЯ з 12 гадз. да 2 гадз. і з 5 да 9 гадз. увечары. 2—1

ПЛЯН

разьмеркаваньня дроў гартопам і гарпрафсаветам на II квартал 1933 г. па № 5 дрывяной карткі паміж ЦРК і ЗРК.

ЦРК	7000	к.м.
ТСТ чыгункі	3500	„
ЗРК „Сьцяг індустрыял."	3220	„
ЗРК „Прафінтэрн"	1380	„
Панчошная ф-ка імя КІМ	2800	„
Панчошная ф-ка імя К. Цэт.	1200	„
Скурнікі	2000	„
Фабрыка „Дзьвіна"	2700	„
Белгандаль	1700	„
„Чырвоны мэталіст"	1500	„
Акулярная	10 0	„
Шчоткамбінат	5.0	„
Доррабкооп	200	„
ТСТ воднікаў	500	„

УВАГА. №№ 3 і 4 дрывяных картэк скасоўваюцца і вышэйпаказаныя ЗРК і ЦРК павінны атрымаць ордэры НЕ ПАЗЬНЕЙ 5 ЧЭРВЕНЯ г. г.

Гарпрафсавет.
Гартоп.
478—1—1

Згублена пячатка калгасу „Чырвоныя зарыбнікі", Замастоцкага сельсавету, якую лічыць несапраўднай. 474—1—1

Дрожджазаводу ПАТРАБУЕЦЦА ПАРА КОНЯЙ для перавозкі дяжджараў. 467—2—2

Мясцком і служачыя заразнай больніцы выражаюць глыбокае спачуваньне свайму супрацоўніку ГАРБ Эмэ Александраўне з прычыны сьмерці

ЯЕ БАЦЬКІ,

якая пасьледвала 28-га мая г. г.

Да ведама пайнікаў.

Праўленьне ЦРК паведамляе, што

ПРЫМАЦАВАНЬНЕ ПАЙНІКАЎ

да крам на атрыманьне хлеба і прадуктаў на чэрвень месяц

будзе вытвараецца па 3 чэрвеня

уключна, пасьля чаго ніякія прымацаваньні вытвараецца ня будуць.

484—2—1 ПРАЎЛЕНЬНЕ ВЦРК.

Праўленьне ВЦРК паведамляе

трымацеляў абмененых АВАНСАВЫХ ордэраў, што праз краму № 120, якая знаходзіцца па Вагзальнай вул. № 29|23,

адпускаюцца па паказаных авансавых ордэрах наступныя тавары: мануфактура, трыкатаж, бялізна і інш.

Просьба паклапаціцца аб хутчэйшым атрыманьні тавараў, не пазьней 1 чэрвеня г. г.

485—2—1 ПРАЎЛЕНЬНЕ ВЦРК.

ПРАДАЕЦЦА КАНЦЭРТНАЕ ПІАНІНА —ШРЭДЭР.

Вял. Ільліньская, 40.

464—2—1

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Віцгарліт № 12. Друкарня „Камінтэрн", Бальшавіцкая, 10.